**УДК 130.2(316.77)**

# ДЫСКУРСІЎНЫ АНАЛІЗ МІШЭЛЯ ФУКО ЯК ДАСЛЕДЧЫ МЕТАД: ТРЫ ПРАЦЭДУРЫ АНТАЛАГІЗАЦЫІ І ТРЫ СТРАТЭГІІ РЭЦЭПЦЫІ

***І.М. НОВІК***
***(Цэнтр гісторыка-філасофскіх і кампаратыўных даследаванняў***
***Інстытута філасофіі НАН Беларусі, Мінск)***

*Прысвечана выяўленню тых ідэй Мішэля Фуко, якія могуць быць аднесены да яго тэорыі «дыскурсіўнага аналізу». Паказана, што на сёння дыскурсіўнаму аналізу Фуко ўласціва пэўная інтэрпрэтацыйная «засмечанасць» наступнымі трактоўкамі і каментарыямі. У якасці рашэння дадзенай праблемы прапануецца вярнуцца да арыгінальных прац самога французскага філосафа. Але і на ўзроўні гэтых арыгіналаў даследнікі сустракаюцца з пэўнымі цяжкасцямі кагерэнтнага прачытання, звязанымі з непаслядоўнасцямі тэкстаў самога Фуко. Наш адказ на азначаныя праблемы, як і наша стратэгія канцэптуальнага ўзнаўлення тэорыі дыскурсіўнага аналізу Фуко, грунтуюцца на падзеле дадзенай тэорыі на тры рубрыкі, у адпаведнасці з трыма працэдурамі анталагізацыі (фенаменалагічная, таксанамічная і метафізічная). Асноўныя разначытанні і цяжкасці ў кагерэнтным узнаўленні ідэй дыскурсіўнага аналізу неабходна атрыбутаваць трэцяй працэдуры – метафізічнай. Прапанаваны намі падзел на тры рубрыкі мусіць разглядацца як падзел на тры паслядоўныя і іерархічныя ступені, таму і сцэнарыяў магчымага ўспадкавання тэорыі Фуко мусіць быць таксама тры.*

***Ключавыя словы:*** *дыскурсіўны аналіз, Мішэль Фуко, дыскурс, дыскурсіўная фармацыя.*

На сёння ў айчыннай філасофіі адносна дыскурсіўнага аналізу і самога паняцця «дыскурс» склалася парадаксальная сітуацыя. З аднаго боку – дыскурсіўны аналіз не толькі не раз даводзіў сваю плённасць і эўрыстычнасць, але ж уяўляе з сябе ў сучаснай заходняй навуцы «growth industry» (індустрыю ў росце) [11, p. 100]: заваёўвае ўсё новыя дысцыпліны (лінгвістыка і літаратуразнаўства, гісторыя і сацыялогія, паліталогія і нават псіхіятрыя) і абшары дастасавання, разам з тым абрастаючы ўсё большым корпусам тэарэтычнай літаратуры. З другога боку, акурат надзвычай шырокі спектр падыходаў і дысцыплін, дзе ён выкарыстоўваецца ў якасці аналітычнага і метадалагічнага інструменту, разам з пэўнай навізной самога тэрміну «дыскурс», як і цяжкасцю фенаменалагічнага схоплівання рэферэнтнай прадметнасці, спрычыніліся да наяўнасці вялікага спектру варыянтаў яго вызначэння і інтэрпрэтацыі. Без дакладнага вызначэння, якой стратэгіі інтэрпрэтацыі і аперавання паняццем «дыскурс» прытрымліваецца аўтар, яго выкарыстоўванне не болей чым затуляе канцэптуальную беспадстаўнасць тэарэтычных пабудоваў і ўцёкі ад адказнасці за зробленыя высновы. Пашыранасць падобнага падыходу мае сваім вынікам агульную падазронасць, асабліва сярод старэйшага пакалення беларускіх навукоўцаў, да самога тэрміну, нібы само яго выкарыстоўванне з непазбежнасцю дэзавуюе навуковую некампетэнтнасць прамоўцы. Такое стаўленне, няхай і мае прычыны для выбачэння, усё ж, на нашу думку, з'яўляецца крайнасцю, «выплюхваннем дзіця разам з вадой». Сярод галоўных віноўнікаў такога стану рэчаў часцей за ўсё называюць Мішэля Фуко. І, ізноў жа, не без падставы. Але не таму, што ён сам заблытаў паняцце «дыскурсу» і стварыў перадумовы сённяшняга яго неахайнага выкарыстання – як схільны думаць праціўнікі ягонай творчасці. Але ж таму, што часта згадкі Фуко і яго тэорыі дыскурсіўнасці ў працах беларускіх навукоўцаў граюць хутчэй арнаментальную функцыю спасылкі на аўтарытэт і даніны модзе, чымсьці сапраўднай канцэптуальнай рэцэпцыі[1].

Зрэшты, усё вышэйапісанае не з'яўляецца апрычонай сітуацыяй, у якую собіла трапіць выключна беларускую гуманітарную навуку. Агульнай азнакай сённяшняга бытавання дыскурсіўнага аналізу без прывязкі да нацыянальных кантэкстаў[2] з'яўляецца тое, што амаль ніводнае даследаванне гэтага метаду, ці з дапамогай гэтага метаду, не абыходзіцца без спасылак на Мішэля Фуко, як на пачынальніка і запачаткоўцы традыцыі [13, p. 12], і ў той жа самы час сам гэты пачынальніцкі статус і канкрэтнае месца, якое Фуко займае ў традыцыі развіцця дыскурсіўнага аналізу, застаюцца цьмянымі як зыходзячы з тэкстаў падобных даследаванняў, так і, відаць, для саміх іх аўтараў.

---

[1] гэта можа засведчыць і навуковая «якасць» большасці падобных спасылак – значнаю частку з іх складаюць простыя спасылкі на імя М. Фуко, ці, у лепшым выпадку, на адну з яго прац увогуле, а не на канкрэтныя старонкі і крытычную літаратуру.

[2] агульны агляд усяго спектру існых на сёння варыянтаў інтэрпрэтацыі і дастасавання ў канкрэтных эмпірычных даследаваннях тэорыі дыскурсіўнага аналізу Фуко з разбіўкай па нацыянальных традыцыях можна знайсці ў [4].

Болей таго, як пераканаўча даводзіць у сваім артыкуле «Дыскурс пра дыскурс: да археалагічнай гісторыі інтэлектуальнага канцэпту» Кіт Сойер [19], тое месца, якое адводзіцца ў сучаснай англа-амерыканскай традыцыі дыскурсіўнага аналізу Мішэлю Фуко, як і інтэрпрэтацыя яго ўласнага разумення паняцця «дыскурс», увогуле грунтуюцца на своеасаблівым Quiproquo. Пры тым што ангельская мова сёння выступае ў якасці lingua franca сучаснай навукі, гэтае блытанне працягвае ўзнаўляцца ў іншых нацыянальных кантэкстах, за выключэннем хіба што ўласна французскага.

З'яўленне ў асадах англа-амерыканскай навукі паняцця «дыскурс» Сойер прымяркоўвае да 70-х гадоў мінулага стагоддзя і звязвае з дзейнасцю брытанскіх марксістаў, з школай, якая атрымала назву «Культурных даследаванняў» (Cultural studies), а менавіта з двума тагачаснымі асяродкамі і напрамкамі развіцця брытанскага марксізму – з школай аналізу фільмаў і тэлебачання ўвогуле, вядомай як «Screen theory», звязанай з часопісам «Screen», і з «Цэнтрам сучасных даследаванняў культуры» (Centre for Contemporary Cultural Studies – CCCS) пры Універсітэце Бірмінгема [ibid., p. 442]. Патрэбай, якую задавальняла такая канцэптуальная інавацыя, быў пошук замены для паняцця «культура», якое падавалася занадта палітычна нейтральным і, як правіла, вызначалася праз супрацьпастаўленне матэрыяльнаму, што, відавочна, не магло здавальняць адэптаў Маркса [ibid., p. 448]. Пры гэтым мелася на ўвазе ў першую чаргу крытыка сучаснай, так званай «спажывецкай» культуры. Менавіта з прыцэлам на гэтыя мэты і быў абраны тэрмін «дыскурс», які быў пазычаны ў вучня Альцюсера Мішэля Пэшо (Michel Pêcheux) [ibid., p. 442]. Гэтак жа сама як і сам Пэшо, брытанскія марксісты ўспрымалі гэтае паняцце як развіццё Альцюсераўскай трактоўкі канцэпту «ідэалогія» і яго ўласнай тэорыі «інтэрпеляцыі». Дзеля далейшага семантычнага насычэння тэрміну «дыскурс» былі выкарыстаны ідэі Лакана і, часткова, Сасюра. Пры гэтым тэрмін выкарыстоўваўся ў вельмі пашыраным значэнні, фактычна – як замена марксісцкага паняцця «ідэалогіі» і інтэрпрэтаваўся ў якасці рэальнасці, што ўлучае любыя сімвалічныя сістэмы. Акурат пераважна да пазалінгвістычных, пазатэкстуальных феноменаў і дастасоўвалі такім чынам утворанае паняцце дыскурсу брытанскія марксісты: станавілася магчымым весці размову пра «дыскурс кіно», «дыскурс моды» і г.д. Пры гэтым атрыманай канцэптуальнай пабудове не ставала гістарычнага матэрыялу, яна выглядала занадта атэмпаральнай. Дзеля папаўнення гэтай нястачы брытанскія марксісты і звярнуліся да М. Фуко, але да ягоных пазнейшых прац, напісаных пасля «Дысцыплінаваць і караць» (Surveiller et punir), улучна з апошняй [ibid., p. 445]. Праблема ў тым, што акурат у гэты перыяд сваёй творчасці Фуко амаль адмаўляецца ад актыўнага канцэптуальнага выкарыстання паняцця «дыскурс», і ўзгадкі апошняга на старонках яго кніг маюць выключна спарадычны характар. Першае пакаленне прадстаўнікоў «культурных даследаванняў» добра разумела гэты факт, як і тое, што пашыраную трактоўку дыскурсу, якой яны карысталіся, наўрад ці магчыма ўзводзіць да Фуко, таму пры азначэнні дыскурсу выкарыстоўвала спасылкі на Пэшо, Альцюсера і, часам, Лакана [ibid., p. 445]. Але ўжо другая хваля прадстаўнікоў брытанскіх «даследаванняў культуры» (размова ідзецца пра 80-я гады XX стагоддзя), не будучы добра абазнанай ў рэаліях французскай філасофіі, а падчас і проста – не валодаючы французскай мовай, пачала атрыбутаваць гэты канцэптуальны гібрыд (утвораны з трактоўкі дыскурсу, угрунтаванай на ідэях Альцюсара, і з гістарычных прыкладаў пазычаных у «позняга» Фуко) непасрэдна да самога Фуко, які быў у той час значна больш вядомым і папулярным за сваіх суайчыннікаў-філосафаў [ibid., p. 446]. Паступова ўсё болей даследаванняў пачало спасылацца ў шырокім тлумачэнні дыскурсу на Фуко, без прывязкі да канкрэтных прац апошняга [ibid.]. Такое разуменне ролі Фуко ў гісторыі дыскурсіўнага аналізу пасля перакачавала разам з тэорыямі брытанскіх марксістаў у ЗША, дзе прыжылося ў рознага кшталту феміністычных і літаратурных штудыях, а разам з імі трапіла і ў сусветную навуку. Такім чынам, тыя беларускія навукоўцы, якія лічаць дастатковай умовай пры выкарыстанні паняццяў дыскурсу ці дыскурсіўнага аналізу зрабіць проста адсылку да імя Фуко, нібы кожная старонка яго прац можа служыць надзейным канцэптуальным апірышчам для любых разважанняў на гэты конт, не болей (але і не меней), чым паўтараюць агульнапашыранае Quiproquo, запачаткаванае брытанскімі марксістамі ў 80-я гады мінулага стагоддзя.

Іронія лёсу не толькі ў тым, што Фуко, калі не адмаўляецца ад сваіх уласных ідэй дыскурсіўнага аналізу ў «Дысцыплінаваць і караць» і далейшых працах, то, прынамсі, значна радзей карыстаецца імі і дапаўняе шэрагам іншых інтэрпрэтацыйных практык, але яшчэ і ў тым, што акурат праз завочную палеміку з Альцюсерам і ягонай школай ён фармулюе сваё ўласнае бачанне таго, чым ёсць дыскурс.

Выйсце з гэтых семантычных лабірынтаў, звязаных з паняццем дыскурсу і ягоным разуменнем Фуко, нам бачыцца толькі ў адным – ізноў звярнуцца да саміх тэкстаў французскага філосафа. Прычым з апошніх нас будуць цікавіць толькі тыя, дзе паняцце «дыскурсу» ляжыць навідавоку, дзе яно канстытуе канцэптуальны каркас, і асноўнай мэтай якіх з'яўляецца метадалагічная рэфлексія. Такім чынам, нас будуць цікавіць выключна ўласныя меркаванні самога Фуко – чым і якім можа быць / мусіць быць

дыскурсіўны аналіз, пакідаючы без адказу, прынамсі покуль, пытанне, што сярод яго творчасці яшчэ можа быць рэтраспектыўна ці «перспектыўна» ўлучана ў арсенал дадзенай метадалогіі.

Зыходзячы з дадзеных патрабаванняў мы застаемся сам насам з яго метадалагічным magnum opus «Археалогія веды» і, крыху шырэй: з шэрагам метадалагічных прац, напісаных французскім філосафам на адцінку паміж «Словамі і рэчамі» і «Дысцыплінаваць і караць». Апроч уласна «Археалогіі веды», тут вартыя ўзгадкі два тэксты, якія непасрэдна папярэднічалі «Археалогіі …» і ў якіх былі сцісла і начарна сфармуляваны яе асноўныя ідэі: «Аб археалогіі навук: адказ эпістэмалагічнаму гуртку» [6], «Палітыка і даследаванне дыскурсу» [8]. Абодва ўяўляюць сабой пісьмовыя адказы на пытанні, сфармуляваныя французскім «эпістэмалагічным гуртком» (Cercle d’Épistémologie): «Аб археалогіі навук» адказвае на шэраг пытанняў, сфармуляваных, каб падукладніць метадалагічныя асады аўтара «Словаў і рэчаў», у той час як «Палітыкі і даследаванне дыскурсу» адказвае ўжо на пытанні, якія з'явіліся ў чальцоў «гуртка», калі яны пабачылі першы адказ Фуко. Нарэшце, чацвёрты істотны тэкст, у якім мы маем справу з артыкуляванай метадалогіяй і з актыўным выкарыстаннем канцэпту «дыскурс» (тут ён нават з'яўляецца ў назве тэксту) гэта «Парадак дыскурсу» [7] – канспект яго інаўгурацыйнай прамовы, прачытанай напярэдадні ўступлення на пасаду прафесара кафедры гісторыі мыслі Калеж дэ Франс.

Але нават калі звярнуцца да арыгінальных поглядаў М. Фуко на дыскурс спробы канцэптуальнай рэканструкцыі тэорыі дыскурсіўнага аналізу паводле французскага філосафа могуць сутыкнуцца з разначытаннямі і нават семантычнымі апорыямі, крыніцай якіх выступаюць ужо самі тэксты Фуко. «Археалогія веды» дае падставы для нагэтулькі адрозных інтэрпрэтацый, што змусіла некаторых крытыкаў, якіх нельга ўпікнуць у адсутнасці чуллівасці да яе тэксту, увогуле канстатаваць «метадалагічны правал Археалогіі» [5, p. 79-100]. Адной з асноўных крыніц такіх цяжкасцяў інтэрпрэтацыі з'яўляецца тая асаблівая стылістыка і танальнасць, у якіх напісаная «Археалогія».

Логіка нарацыі ў «Археалогія веды» цыклічная – Фуко не падае азначэнні тэрмінаў у парадку ўзрастання іх сістэмнай складанасці, але ж пераскоквае паміж рознымі ўзроўнямі, звяртаючыся да тых жа самых праблем з увядзеннем новых тэм і канцэптаў. Спачатку Фуко знаёміць чытача з паняццем дыскурсіўнай фармацыі і толькі пасля спрабуе вызначыць «выказванні» як падставовы элемент гэтых самых фармацый, сканчаецца ж кніга параўнаннем «археалагічнага праекту» з іншымі метадалогіямі даследавання інтэлектуальнай гісторыі. Калі, крыху адвольна, дастасаваць да філасофскіх твораў паняцце жанру, то гэту кнігу можна аднесці да рубрыкі своеасаблівых «філасофскіх дэтэктываў», уведзеных у філасофскі рэпертуар напэўна Гайдэгерам – тэкст разгортваецца такім чынам, каб стварыць у яго чытача ўражанне, што тыя альбо іншыя хады думкі, канцэптуальныя рашэнні адначасовыя з аповедам; што пэўныя тэарэтычныя развязванні прадыктаваныя самім разгортваннем наратыву, а канчатковы вынік і фінальныя высновы невядомы самому аўтару ў сярэдзіне напісання кнігі. Такая падача, вядома, дадае тэксту пэўнай сугестыўнасці і рытарычнай пераканаўчасці і, апроч таго, дазваляе пазнаёміцца з «механікай» аўтарскага мыслення, але ж, у той жа час, аддаляе яго ад сістэматычнасці і транспарэнтнасці, тым болей што ў дадзеным выпадку ідзецца пра метадалагічны трактат.

Апроч таго, Фуко відавочна болей рупіцца пра тое, каб адасобіць і супрацьпаставіць прапанаваныя ім падыход і адзінкі аналізу ад іншым падобных, чымсьці азначыць іх унутраны змест. Перавага такіх адмоўных «азначэнняў» у тэксце «Археалогіі веды» нагэтулькі заўважна, што Морыс Бланшо параўноўваў археалагічны праект з «пафатычнай тэалогіяй» [2, p. 26], а Жак Рэвель[3] выказаў меркаванне, што «Археалогіі веды», па аналогіі з кнігай К’еркегора «Альбо-альбо», болей пасуе назва «Ані гэта, ані гэта» [16, p. 14].

Калі зрабіць спробу рэканструяваць ідэі «Археалогіі веды» ў больш акадэмічным духу – разгарнуўшы іх у сістэмным парадку, паводле ўзрастання шчыльнасці іх сувязяў, ад болей абстрактных да болей канкрэтных, і падаючы іх дадатныя азначэнні, то, з пэўнай доляй умоўнасці, іх можна падзяліць на тры рубрыкі, адпаведныя тром працэдурам анталагізацыі, якія мы назавем фенаменалагічнай, таксанамічнай і метафізічнай.

На фенаменалагічным этапе ідзецца пра першаснае схопліванне доследнай «тэрыторыі», разметку гарызонту тэматызацыі, што прадугледжвае па-першае, выяўленне тых фрагментаў існага, адносна якіх развіваюцца працэдуры дыскурсіўнага аналізу і на якія праецыруюцца высновы, атрыманыя дыскурсіўным аналітыкам, па-другое, выпрацоўку адметнай устаноўкі, спосабаў усталявання і ўтрымання доследнай дыспазіцыі, якая дазваляе ўбачыць інтэлектуальныя артэфакты пад патрэбным вуглом.

---

[3] вядомы французскі гісторык

Таксанамічны этап акрэслівае той «анатамічны тэатр», у якім працуе дыскурсіўны аналітык: згодна з якой аналітычнай рашоткай ён расчляняе выяўленую на першым этапе доследную рэчаіснасць, на які канцэптуальны каркас нанізвае дыскурсіўныя феномены. Дадзены этап прадугледжвае вылучэнне ў прадметным полі адзінак аналізу, якімі выступаюць выказванні і дыскурсы. Калі быць болей дакладнымі, то Фуко прапануе не столькі «выказванні» і «дыскурсы» ў якасці падставовых адзінак археалагічнага аналізу, колькі два семантычных гнязда, звязаных з дадзенымі паняццямі, якія ўлучаюць такія канцэптуальныя шэрагі, як «поле выказванняў» – «выказванне» – «функцыя выказвання» – «акт выказвання», «дыскурс» – «дыскурсіўная практыка» – «дыскурсіўная фармацыя», якія і выступаюць элементамі аналітычнай рашоткі «Археалогіі».

Трэці этап, трэцяя працэдура анталагізацыі, якую мы назвалі «метафізічнай», угрунтавана на змяшчэнні вылучаных адзінак у сукупнасці адносінаў залежнасці, карэляцыі і дэтэрмінацыі, якія спалучаюць іх як паміж сабой, так і з пазадыскурсіўнымі элементамі, з увядзеннем у канцэптуальны апарат «Археалогіі» такіх паняццяў, як рэгулярнасці, законы, падзеі.

Пры такім падзеле становіцца заўважным, што цяжкасці кагерэнтнага прачытання метадалагічнага трактата Фуко, з якімі сутыкаюцца крытыкі, не аднолькава стасуюцца з трыма адзначанымі працэдурамі анталагізацыі, але ж звязаныя пераважна з трэцяй, завяршальнай.

На ўзроўні першаснай канцэптуальнай разметкі прадметнага поля дыскурсіўнага аналізу амаль ніхто з каментатараў не адмаўляе Фуко ў тым факце, што яму ўдалося выкраіць сярод феноменаў інтэлектуальнай культуры асаблівы абшар, дзе праз маўленне веда ўзаемна стасуецца са сваімі сацыяльнымі і палітычнымі эфектамі, дзе адметныя рэжымы ісціных выказванняў набываюць сваё гістарычнае вымярэнне. Гэтак жа сама, наўрад ці выклікае асаблівыя пярэчанні тэзіс, што «Археалогія веды» ўзброіла сучасную гуманітарыстыку адметным рэжымам прачытання тэкстаў, увяла новую дыспазіцыю доследнага погляду, якая дазваляе эфектыўна увідавочыць усю неспадзеўнасць і выпадковасць тых «бясспрэчнасцяў», з якіх складаецца сучаснасць. Тут, наадварот, хутчэй варта паўшчуваць некаторых крытыкаў Фуко, якія не далі рады заўважыць, што дыскурсіўны аналіз, такі, якім яго задумаў Фуко, з'яўляецца «кропкавым» інструментам, наладжаным на працу з дакладна акрэсленай сукупнасцю феноменаў, і выхад за гэтыя межы пагражае стратай канцэптуальнага апірышча з боку тэарэтычных пабудоваў «Археалогіі веды». Дыскурсіўны аналіз, такі, якім яго бачыў французскі філосаф, не з'яўляецца ўніверсальнай адмычкай, аднолькава прыдатнай да інтэрпрэтацыйнага «размыкання» любых культурных артэфактаў. Мы лічым, што сувязь з ведай (у тым сэнсе, які гэтаму паняццю надаваў Фуко) і гістарычнасцю з'яўляецца канстытутыўнай для тэорыі дыскурсіўнага аналізу, пададзенай у «Археалогіі веды». Не адмаўляючы таго факту, што сама метадалогія дыскурсіўнага аналізу ў іншых варыянтах можа мець больш шырокія гарызонты свайго дастасавання, мы пры гэтым настойваем, што там, дзе дыскурсіўны аналітык працуе ў плашчыні іншай, чым гістарычная эпістэмалогія, канцэптуальны апарат філасофіі Фуко не можа быць яму зарукаю тэарэтычнай рэлевантнасці.

Гэтак жа сама мы змушаны засмуціць тых, хто разглядае дыскурсіўны аналіз Фуко як спраўны інструмент для выкрыцця буржуазнай, сексісцкай ці іншай падобнай ідэалогіі, а ў самім французскім філосафе шукае зацятага хаўрусніка паходу супраць заганаў сучаснага грамадства ў імя марксісцкай, феміністычнай і д.п. праўды. «Археалогія веды», нягледзячы на сваю назву, не з'яўляецца раскопваннем і асуджэннем «пeражыткаў» мінуўшчыны, інкруставаных у сучаснасць праз выпадковае і састарэўшае напластаванне на гуманітарныя дыскурсы іншародных ідэалагем. Яна не выкрывае іх у імя будучай ісціны болей гуманнага і гарманічнага грамадства, адзінкавымі носьбітамі якой у сучаснасці выступае абранае кола даследнікаў. Гэтак жа сама непрыдатны дыскурсіўны аналіз Фуко і да ацэнкі культурных феноменаў паводле аксіялагічнай шкалы, прачытанай у геаграфічных тэрмінах: розныя прадстаўнікі транзіталагічнага падыходу, якія жадалі б заручыцца падтрымкай французскага філосафа ў выкрыцці недастаткова- і неда- еўрапейскіх феноменаў у сённяшняй беларускай культуры, на наш погляд, памыляюцца ў выбары тэарэтычнага хаўрусніка. Для Фуко няма абранага часу і тэрыторыі: калі наша ўласная мінуўшчына з'яўляецца нам у пачварных і жахлівых формах, тое адчужэнне, якое мы адчуваем ў стасунку да яе, з'яўляецца асуджэннем і нашай цяпершчыны. Асноўная, праграмная гіпотэза, якой павінен узброіцца дыскурсіўны аналітык паводле Фуко, ёсць гіпотэза своеасаблівага гістарычнага песімізму: калі мы не пазнаем сябе ў люстэрку мінуўшчыны, то гэта не дзеля таго, што нам удалося падняцца ў параўнанні з папярэднікамі на яшчэ адну прыступку па лесвіцы гуманнасці і ісцінасці, але таму, што за нашымі спінамі неўпрыкмет змяніліся дыскурсіўныя перадумовы, якія задаюць контуры нашай сучаснасці.

Выкарыстанне тэорыі Фуко для аднабокага выкрыцця ідэалагічных скажэнняў з'яўляецца парушэннем той эфектыўнай дыстанцыі, якая і характарызуе ўстаноўку дыскурсіўнага аналізу. Апошні

не з'яўляецца ўваходам ва ўтульны чорна-белы свет ілжывай ідэалогіі і яе выкрываццеляў, але – у небяспечны свет «перспектывізму» (у ніцшэанскім сэнсе гэтага слова). Так, археалагічны метад Фуко паказвае непазбежную знітаванасць сацыяльнай і гуманітарнай веды з уладай і прагай яе, адтуляе непазбежныя выпадковасць, неспадзеўнасць, праз якія ўтварала гісторыя нашы навуковыя «неабходнасці». Але, пры гэтым, дыскурсіўны аналіз Фуко не з'яўляецца актам эпістэмічнай інтэрвенцыі, які прыўлашчвае права прамаўляць ад імя рэпрэсаванай ісціны, ён не мяняе месцазнаходжанне ісціны, якая была б пахаванай пад зацікаўленасцямі сацыяльных актараў, але пытае ў самой ісціны – уцялесненнем якіх уладных амбіцый яна з'яўляецца, якія сацыяльныя эфекты яна нясе фактам свайго прамаўлення.

Вядома ж, як і любая скрайнасць, давядзенне да лагічнага канца такой пазіцыі – да абсалютнага гістарычнага рэлятывізму, будзе выглядаць абсурдна. Наўрад ці ў Фуко выклікала сумненне наяўнасць у нашай гісторыі безварункава негатыўных з'яў, болей альбо меней рэпрэсіўнага характару рэжыму функцыянавання ўладных практыкаў. Але там, дзе мы спяшаемся з такімі занадта відавочнымі і занадта слушнымі ацэнкамі, дыскурсіўны аналіз мусіць спыніцца на момант, каб спытаць: якія ўладныя інтэнцыі ўцялесніваюць такія ацэнкі, якую прагу да ўлады спаталяе канстатацыя гэтых відавочнасцяў і слушнасці, якія разрэзы праводзіць у целе сучаснасці такая веда пра заганы мінулага, якія траншэі будучых бітваў яна тым самым рые[4].

Тое, што вылучае падыход аўтара «Археалогіі веды», гэта своеасаблівы «мужны скепсіс», які не спяшаецца ў дыхатамічных ацэнках і выкарыстоўвае кожную відавочнасць «няслушнасці» мінулага, каб запытацца аб тых выгінах шляху да ісціны, якія ўласцівы нам самім. У гэтым сэнсе дыспазіцыя дыскурсіўнага аналізу – гэта разамкнёнасць да полівaрыянтнасці і небяспечнасці як сучаснасці, так і будучыні. Тыя непрадбачаныя разыходзячыяся сцежкі, якімі вяртаецца да нас мінулае праз археалагічную оптыку, з'яўляюцца прадвесцем неўнікнёнай неспадзеўнасці будучыні, якая насоўваецца на нас. «Борхесаўскі смех», які выклікаюць у нас нягеглыя спробы мінулага спарадкаваць множнасць, можа ў любы момант прагучаць за спіной нашай навуковай сур'ёзнасці і руплівасці.

На ўзроўні вылучэння адзінак аналізу некаторыя з каментатараў выказвалі сумневы, наколькі канцэптуальныя сродкі «Археалогіі веды» з'яўляюцца дастатковымі для дакладнай лакалізацыі і ідэнтыфікацыі «дыскурсіўных фармацыяў» і «выказванняў» [гл. напр. 3], няма сярод крытыкаў таксама і згоды адносна таго, на якія паняцці ў семантычных гнёздах, звязаных з выказваннямі і дыскурсамі, прыпадае галоўны лагічны акцэнт [ibid., p. 207][5], але, у цэлым, сярод даследнікаў пануе кансенсус з нагоды таго, што Фуко з'яўляецца не толькі аўтарам арыгінальнай інтэрпрэтацыі тэрміна «дыскурс» і «віноўнікам» яго шырокага ўвядзення ва ўжытак найноўшай гуманітарнай навукі, але ж і аўтарам цэласнай канцэптуальнай рашоткі, здатнай на структурнае і ўніфікаванае прадстаўленне рэальнасці інтэлектуальнай гісторыі. Паспрабуем расшыфраваць болей падрабязна нашу апошнюю думку: калі часова адкінуць канкрэтную «фізічную» (дакладней метафізічную) інтэрпрэтацыю сувязяў падпарадкавання, праз якія, напрыклад, выказванні ўлучаюцца ў дыскурсіўныя фармацыі, пакінуўшы покуль толькі фармалізаваныя «жамерыны» сістэмы паняццяў «Археалогіі веды» і структуры іх сувязяў, то наўрад ці ў каго з крытыкаў будзе выклікаць пярэчанне безварункавая эўрыстыка такой пабудовы. Так, некаторыя з каментатараў «Археалогіі веды» выказвалі меркаванні пра пэўную каструбаватасць і празмернасць канцэптуальнай машынерыі кнігі, але гэтыя заўвагі могуць быць падставай толькі для далейшага развіцця і ўдакладнення археалагічнага праекту, але ж аніяк – для поўнага яго адпрэчання ў якасці відавочна «правальнага».

У нашай рэканструкцыі гэты канцэптуальны каркас дыскурсіўнага метаду Фуко выглядае наступным чынам:

1) элементарны ўзровень, з якім працуе дыскурсіўны аналіз, складаецца з *выказванняў*, якія разглядаюцца ў якасці далей нераскладальных адзінак, сінгулярных падзей у дыскурсіўным полі;

2) выказванні парадкуюцца ў *серыі выказванняў*, якія варта разглядаць як серыі рэалізацый тоеснай *функцыі выказвання*;

3) функцыя выказвання ёсць тым, што ўтварае адносіны адпаведнасці паміж знакамі і чатырма паверхнямі: а) карэлятаў, б) суб'ектыўных пазіцый, в) асацыяванага абшару і г) матэрыяльнасці;

---

[4] le savoir n'est pas fait pour comprendre, il est fait pour trancher [9, p. 148]: што можна перакласці як «веда створана не для разумення, яна створана для разрывання».

[5] у прыватнасці – шмат хто з крытыкаў настойвае, што такі акцэнт сярод паняццяў, звязаных з дыскурсам, прыпадае на «дыскурсіўную практыку» [1, p. 177; 15, p. 195–196; 19, p. 447].

4) серыі выказванняў улучаюцца ў якасці элементаў у тую альбо іншую дыскурсіўную фармацыю за конт уласцівых дыскурсіўным фармацыям чатыром тыпам рэгулярнасцяў фармавання: а) фармавання аб'ектаў, б) фармавання мадальнасцяў выказванняў, в) фармавання канцэптаў і г) фармавання стратэгій;

5) уся дадзеная сукупнасць азначэнняў стасуецца дыскурсіўнага поля, якое супрацьпастаўляецца пазадыскурсіўным практыкам, інстытутам і тыпам уладарання.

Такім чынам, дыскурсіўны аналіз Фуко ёсць (з неабходнасцю, але ж не з дастатковасцю) прачытаннем рэчаіснасці ў адпаведных паняццях. На функцыянальным узроўні гэтае прачытанне ў адпаведных паняццях азначае наступнае:

– Для паняцця «выказванняў»: дыскурсіўнае поле разглядаецца як дыскрэтнае па сваёй прыродзе, дыскурсіўны аналіз па Фуко прадугледжвае інтэрпрэтацыйную разамкнёнасць і гатоўнасць да схоплівання падзеі-выказвання ў інстанцыі нечаканасці, сінгулярнасці яе ўзнікнення і ўрывання.

– Для паняцця «функцыя выказвання»: дыскурсіўны аналіз мусіць утрымліваць выказванні ў каардынацыйнай сетцы пытанняў: якія абшары аб'ектаў выяўляюцца выказваннем? якую пазіцыю неабходна займаць суб'екту, каб мець магчымасць сцвярджаць тое, што сцвярджае дадзенае выказванне? якія іншыя выказванні яно задзейнічае, узнаўляе самім фактам свайго ўзнікнення? які тып матэрыяльнасці яму ўласцівы?

– Для паняцця «дыскурсіўнай фармацыі»: па-першае, магчымасць і неабходнасць улучэння ў разгляд гісторыі станаўлення той альбо іншай дысцыпліны болей шырокага аналітычнага поля, дзе эпістэмічныя практыкі пераплятаюцца са сваімі сацыяльнымі наступствамі, дзе навуковыя сцверджанні знаходзяць сваю падтрымку ці адлюстраванне ў побытавых, літаратурных і філасофскіх выказваннях; па-другое, гэтае паняцце прадугледжвае магчымасць раптоўных зменаў, перабудовы ўсяго дыскурсіўнага ладу таго альбо іншага навуковага, дысцыплінарнага дыскурсу.

Асноўны інтэрпрэтацыйны «рухавік» дыскурсіўнага аналізу Фуко – гэта атрыбуцыя выказванняў і серый выказванняў да той ці іншай дыскурсіўнай фармацыі, якая адбываецца на тле разгляду спадарожных недыскурсіўных падзей, сацыяльных інстытутаў і практык. Апісанне тых форм дэтэрмінацыі, пасродкам якіх стаецца магчымым такое суаднясенне, з'яўляецца асновай трэцяй працэдуры анталагізацыі – метафізічнай. Акурат тут каментатары сутыкаюцца з найбольшым лікам двухсэнсоўнасцяў, непаслядоўнасцяў і, наўпрост, супярэчнасцяў у тэксце «Археалогіі веды». Складаецца ўражанне, прынамсі з першага погляду, што Фуко спрабуе «ўсядзець на двух крэслах»: адначасова ён карыстаецца філасофскімі «слоўнікамі» трансцэндэнтальнага канстытуявання і фізічнай каўзальнасці, лагічнай магчымасці і рэчаіснага існавання, каб праз пару старонак адпрэчыць адпаведную трактоўку свайго праекту. Менавіта таму «Археалогія веды» сталася падставай для цалкам супрацьлеглых інтэрпрэтацый: адны каментатары абараняюць «матэрыялістычнае» тлумачэнне яе палажэнняў, настойваючы на залежнасці дыскурсіўнага ад вонкавых, матэрыяльных і сацыяльных практык, разглядаючы праект у якасці своеасаблівага адгалінавання «гістарычнага матэрыялізму» [15, pp. 187–213; 17, pp. 39–119], у той час як іншыя прапануюць не меней абгрунтаванае трансцэндэнтальнае прачытанне [10, pp. 17–69], ці прапануюць адкінуць як празмерную і непатрэбную катэгорыю «недыскурсіўнага», бо ўвесь сацыяльны свет магчыма і варта разглядаць як спрэс і наўсцяж дыскурсіўны[6]. Але большасць крытыкаў прыпісваюць гэтыя цяжкасці кагерэнтнага прачытання наўпрост Фуко, настойваючы на немагчымасці ажыццяўлення археалагічнага праекта ў канцэптуальных асадах, прапанаваных аўтарам. Сярод закідаў, якія высоўваліся супраць «Археалогіі …» і яе аўтара, можна вылучыць наступныя:

– блытаніна паміж акрэсленнем умоў магчымасці і кіраваннем [3, p. 191], змяшэнне катэгорый магчымасці, рэгулявання і рэгулярнасці [ibid.];

– адсутнасць здавальняючага тлумачэння адносінаў паміж дыскурсіўнымі і недыскурсіўнымі практыкамі [12, p. 121], нявыразнасць разрозніць паміж сабой паняцці сістэмы, практыкі, закона, структуры і рэгулярнасці, адсутнасць вызначэння цэнтральнага для ўсёй «Археалогіі …» канцэпту «правілы фармавання» [ibid., p. 127];

– блытаніна паміж кантэкстам і сістэмай правіл [18, p. 54], у тым што просты факт прыналежнасці да дыскурсіўнай фармацыі і правілы, якія павінны кіраваць такой прыналежнасцю, успрымаюцца як адное і тое ж [ibid., p. 58];

– ўвядзенне «дзіўнага паняцця рэгулярнасцяў, якія рэгулююць самі сябе» [5, p. 82].

Падводзячы падрахунак, можна выснаваць наступнае:

---

[6] такі варыянт пан-дыскурсіўнага развіцця ідэй Фуко прапануюць, напрыклад, Лякло і Муф [14, pp. 107–108].

– там, дзе дыскурсіўны аналітык спрабуе не ствараць наноў тэарэтычныя перадумовы для сваёй працы, але ж абаперціся на тэорыю, распрацаваную Мішэлям Фуко ў межах «археалагічнага праекту», ён мусіць усведамляць, што для апошняга ўласціва як значная інтэрпрэтацыйная «засмечанасць» наступнымі трактоўкамі, так і пэўныя цяжкасці кагерэнтнага прачытання, звязаныя ўжо непасрэдна з непаслядоўнасцямі тэкстаў самога французскага філосафа;

– наш адказ на азначаныя праблемы, як і наша стратэгія канцэптуальнага ўзнаўлення тэорыі дыскурсіўнага аналізу Фуко, грунтуюцца на падзеле дадзенай тэорыі на тры рубрыкі, у адпаведнасці з трыма працэдурамі анталагізацыі (фенаменалагічная, таксанамічная і метафізічная), у паслядоўнасці якіх і развіваецца дыскурсіўная аналітыка паводле французскага мысляра;

– асноўныя розначытанні і цяжкасці ў кагерэнтным узнаўленні ідэй дыскурсіўнага аналізу, пададзеных у «Археалогіі веды», неабходна атрыбутаваць трэцяй працэдуры: метафізічнай;

– падзел на тры рубрыкі, прапанаваны намі, мусіць разглядацца як падзел на тры паслядоўныя і іерархічныя ступені, таму і сцэнарыяў магчымага ўспадкавання тэорыі Фуко мусіць быць таксама тры: 1) даследнік інтэлектуальнай гісторыі ці дыскурсіўны аналітык падзяляюць з аўтарам «Археалогіі веды» адметную факусіроўку на гісторыю веды і апрычыное яе ўтрыманне ў доследным поглядзе, але пры гэтым стасуюць да гэтага поля свой уласны канцэптуальны інструментары, 2) эмпірычнае даследаванне яднае з французскім філосафам не толькі гэтая агульная скіраванасць погляду, але і канцэптуальныя адзінкі – гэта даследаванне, якое адбываецца ў паняццях «выказванні», «серыі выказванняў», «функцыя выказванняў», «дыскурсіўная фармацыя», але канкрэтнае семантычнае насычэнне гэтых канцэптаў, агульнае тэарэтычнае цэлае, утворанае імі, разрозніваюцца, 3) навукоўца вызнае поўны сюзерэнітэт тэорыі дыскурсіўнага аналізу М. Фуко ў адносінах да свайго даследавання і разглядае яго не болей чымся канкрэтным дастасаваннем «археалагічнай» метадалогіі да новага праблемнага поля;

– у апошнім выпадку, гэта значыць, калі дыскурсіўны аналіз разгортваецца ў поўнай тэарэтычнай лаяльнасці да «Археалогіі веды», лінія спадчыннасці распасціраецца не толькі на канцэптуальны наробак Фуко, але і на ўсе тыя крытычныя закіды, якія былі высунуты інтэрпрэтатарамі кнігі, а таму, каб пазбегнуць тых жа самых абвінавачанняў у супярэчлівасці, непаслядоўнасці і блытаніне, дыскурсіўны аналітык усё адно мусіць пайсці далей за Фуко і прагаварыць, якой з альтэрнатыўных трактовак «метафізічнай» часткі «Археалогіі …» ён прытрымліваецца, на якое кагерэнтнае прачытанне кнігі ён абапіраецца;

– нарэшце, прапанаваны намі падзел дазваляе паставіць яшчэ адно пытанне, якое дае перспектыву для своеасаблівай крытыкі Фуко паводле самога Фуко: мы можам запытаць, наколькі канцэптуальныя адзінкі, прыведзеныя ў «Археалогіі веды», і тэарэтычнае цэлае, утворанае імі, адпавядаюць першаснай задачы – аналізу гісторыі веды, наколькі яны неабходны і дастатковы для развязання гэтай задачы.

ЛІТАРАТУРА


1. Bacchi, C., & Bonham, J. (2014). Reclaiming discursive practices as an analytic focus: Political implications. Foucault Studies, (17), 79–192.
2. Blanchot (1986), M. Michel Foucault tel que je l'imagine. Montpellier, Fata Morgana.
3. Brown, B., & Cousins, M. (1980). The linguistic fault: the case of Foucault's archaeology // Michel Foucault: critical assessments, Volume 2. Barry Smart. Routledge, Dec 31, 1994. – Philosophy. p. 186 – 208.
4. Diaz-Bone (2008), R. et al. The field of Foucaultian discourse analysis: Structures, developments and perspectives //Historical Social Research/Historische Sozialforschung. – 2008. – P. 7–28.
5. Dreyfus, H. L., & Rabinow, P. (2014). Michel Foucault: Beyond structuralism and hermeneutics. University of Chicago Press.
6. Foucault (1968), M. 'Sur l'archéologie des sciences. Réponse au Cercle d' Épistémologie' // M. Foucault Dits et Écrits. 1954–1969, Paris: Gallimard, 1994.
7. Foucault (1971), M. L'ordre du discours. Leçon inaugurale au Collège de France prononcée le 2 décembre 1970 [Paris] : Gallimard, 1971.
8. Foucault (1991), M. 'Politics and the study of discourse', in G. Burchell, C. Gordon and P. Miller (eds), The Foucault Effect: Studies in Governmentality. Chicago: University of Chicago Press. P. 53–72.
9. Foucault (1994), Michel Nietzsche, la généalogie, l' histoire // Dits et écrits, 1954-1988, tome II, 1970–1975, Paris, Gallimard, p. 136–156.
10. Han (2002), B. Foucault's critical project: Between the transcendental and the historical. Stanford University Press.
11. Hook D. (2007) Discourse, Knowledge, Materiality, History: Foucault and Discourse Analysis. In: Foucault, Psychology and the Analytics of Power. Critical Theory and Practice in Psychology and the Human Sciences. Palgrave Macmillan, London

12. Howarth (2002), D. An archaeology of political discourse? Evaluating Michel Foucault's explanation and critique of ideology. Political Studies, 50(1), 117–135.
13. Jørgensen, M. W., & Phillips, L. J. (2002). Discourse analysis as theory and method. Sage.
14. Laclau, E., & Mouffe, C. (2001). Hegemony and socialist strategy: Towards a radical democratic politics. Verso.
15. Lecourt (1975), D. Marxism and Epistemology: Bachelard, Canguilhem and Foucault.
16. O'Farrell (1993), C. Foucault: historian or philosopher? Springer.
17. Olssen (2016), M. Michel Foucault: materialism and education. Routledge.
18. Privitera (1995), W. Problems of style: Michel Foucault's epistemology. SUNY Press.
19. Sawyer (2002), R. K. A discourse on discourse: An archeological history of an intellectual concept. Cultural studies, 16(3), 433–456.


*Пастуміў 28.03.2019*

## DISCURSIVE ANALYSIS OF MICHEL FOUCAULT AS A RESEARCH METHOD: THREE PROCEDURES OF ONTOLOGIZATION AND THREE STRATEGIES OF RECEPTION

***I. NOVIK***

*The article is devoted to identification of the ideas of Michel Foucault, which can be attributed to his theory of "discourse analysis". The article shows that today Foucauldian discourse analysis is characterized by certain blurriness due to subsequent interpretations. As a solution to this problem, we propose to return to the original works of Foucault. But even at the level of the original Foucault's texts researchers face certain difficulties of coherent reading due to some incoherence in works of Foucault. Our response to these challenges, based on the division of the theory into three parts, according to the three procedures ontologization (phenomenological, taxonomic and metaphysical). Major discrepancies and difficulties in a coherent reading of Foucauldian theory, should be attributed to the third metaphysical procedure. This division into three parts correlates with three possible scenarios of the reception of Foucault's theory.*

***Keywords**: discourse analysis, Michel Foucault, discourse, discursive formation, Foucauldian discourse analysis.*